Падтрымай "Вясну" на PATREON

Глыбоцкага журналіста будуць судзіць за “незаконнае пікетаванне” на Дзень Волі

05.04.2019 **Тэгі**: суды, свабода слова, свабода мірных сходаў



Зміцер Лупач у судзе. Фота: Радыё Рацыя

На глыбоцкага журналіста-фрылансера **Змітра Лупача** міліцыянты склалі адміністрацыйны пратакол за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (арт. 23.34 КаАП РБ), піша "Віцебская Вясна". Пра гэта паведаміў на сваёй старонцы ў Facebook сам журналіст. Разгляд справы аб адміністрацыйным правапарушэнні адбудзецца ў Глыбоцкім раённым судзе 11 красавіка.

25 сакавіка глыбоцкія актывісты адзначылі Дзень Волі ўскладаннем кветак да бюсту прэм’ера БНР Вацлава Ластоўскага, да мэмарыяльнай дошкі стваральніку нацыянальнага сцяга Клаўдыю Дуж-Душэўскаму, на магілу сябра Саюзу беларускіх патрыётаў Альберта Бацяноўскага. Пасля гэтага запусцілі бел-чырвона-белы сцяг на паветраных балёніках у неба.

У святкаванні бралі ўдзел 12 глыбачан. Усе дзеянні актывістаў здымалі на камеры супрацоўнікі міліцыі і КДБ, нікога не затрымлівалі. Адміністрацыйны пратакол склалі толькі на Змітра Лупача.

Суды пасля Дня Волі ў Віцебску і Глыбокім:

- 10 красавіка, Віцебск: суд Першамайскага раёну, справа Міколы Качурца аб спагнанні шкоды з Кастрычніцкага РАУС за знішчаны бел-чырвона-белы сцяг (на Дзень Волі – 2018). Пачатак – 10.00.
- 11 красавіка, Віцебск: суд Кастрычніцкага раёну, разгляд адміністрацыйных справаў супраць Міколы Качурца, Яраслава Кійко і Уладзімера Кійко – за фатаграфаванне з бел-чырвона-белым сцягам на Дзень Волі – 2019. Суд прызначаны на 10.00.
- 11 красавіка, Глыбокае: суд Глыбоцкага раёну, адміністрацыйная справа Змітра Лупача (арт. 23.34 КаАП РБ). Пачатак паседжання – 10.00.

Твитнуть







Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў



ГАЛОЎНАЕ

Без зменаў. Адбылася апеляцыя па справе "Вясны"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

Затрыманні ў Брэсце і Віцебску пасля райда па сяброўках: хроніка пераследу 20 красавіка

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022





Напрамкі дзейнасці

ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

EENEMO





















E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY